*Ірына Марозава*

# РУЧНІК У ПОБЫЦЕ БЕЛАРУСА

Шмат стагоддзяў карыстаюцца беларусы ручнікам. Пакупова, год за годам, стагоддзе за стагоддзем выпрацоўваліся і набывалі дасканаласць характэрныя адзнакі традыцыйнага аздаблення беларускага ручніка. Фарміраваўся канон, у рамках якога праходзілі далейшыя творчыя пошукі народнага майстра. Напрамак арнаментацыі ніколі не абмяжоўваў ткачыху, вышывальшчыцу, дазваляў увасабіць у ім свой характар, пачуцці, настрой, сваё адчуванне харастве. Шматаблічны, зменлівы ручнік пераўтвараўся то ў вясельны падножнік, то ў аброчную тканіну, то ў магічную рэч, здольную адхіліць ліха і смерць.

Дакладна не ўстаноўлена, які выгляд меў старажытны беларускі ручнік, але можна ўявіць, што ён быў трошкі меншы па сваіх памерах за сучасны, і арнаментаваўся пераважна шыццём. У каларыстычнай гаме пераважалі, мабыць, шэрабелыя ці прыглушаныя чырвона-карычневыя адценні льнянога прадзіва – суровага, адбеленага або пафарбаванага раслінным рэчывам. [1,9].

Больш дакладныя звесткі пра беларускі ручнік пакінула Сярэдневечча. У судовых дакументах XVI – XVII ст. упамінанні аб ручніках – звычайная справа. Так, з вопісу прыданага, атрыманага гродзенскім «бояриномь Мартином Пашкевичем за женой своей», сярод іншых рэчаў там было «ручников семь локоть вышиваных» [1, 10]

Падобны выраб адлюстраваны на партрэце Ф. Скарыны, змешчаным у яго Біблії 1517-1519 гадоў, дзе вядомы асветнік паказаны за рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным ручніком. Трэба думаць, наш славуты першадрукар быў добра знаёмы з культурнымі помнікамі сваёй зямлі. Тканіна на гравюры выразна передае рысы беларускага ручніка: ромба-геаметрычны арнамент, скампанаванасць яго ў папярочныя палосы, доўгія махры на канцах. [1, 11-12]

Ручнік – рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Сваёй прысутнасцю ў хатнім чырвоным куце ці ў царкве на абразах, на прыдарожным ці надмагільным крыжы ручнік адзначае тую прастору, у якой чалавек здольны ўзняцца да спасціжэння складаных сувязей з Сусветам. [7, 5].

Ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, творчыя памкненні і мастацкае светаўспрыманне. Гэта найкаштоўнейшы здабытак беларускай культуры і мастацтва. Беларусы захавалі да пачатку XXI ст. Незлічонае багацце фальклору, архаічную разнастайнасць і паўнату сямейнай і каляндарна-аграрнай звычаёвасці, традыцыйны касцюм, мастацкія рамёствы. І сярод іх – ручнікі.

Сапраўдны ручнік – гэта не проста кавалак палатна, якім выціраюць твар і рукі. На Беларусі шмат звычаяў, звязаных з выкарыстаннем ручнікоў. На ручніку падносяць хлеб і соль, калі вітаюць дарагіх гасцей, таму што ручнік – гэта сімвал чысціні, цяпла беларускай зямлі і роднай хаты.

Беларускі традыцыйны ручнік можна ўмоўна далучыць да дзвюх груп тканін: дэкаратыўна-абрадавых і гігіенічна-бытавых. Выдзяляюцца наступныя віды ручнікоў: 1)Уціральнік (уціраннік) – на Віцебшчыне яго асноўная служба ў выціранні рук і твару пасля ўмывання. Выглядаў ён усюды аднолькава, каля 1,5 м., аздабляўся карункамі або махрамі. Прычым на патрэбу сям’і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў пасярэдзіне сцяны. У лазню яго не бралі. 2)Скарач – маленькі, квадратнай ці прадаўгаватай формы, канцы нітак асновы, што знаходзіліся за бёрдам і на пражным навоі ткацкага станка і якія нельга заткаць. Сшываўся з дзвюх полак. Ніткі скручваліся ў вяровачкі. Выкарыстоўваўся для накрывання хлеба і солі на стале. Ужываўся для гаспадарчых мэтаў. 3)Трапкач (пацірач, брэндзал) – ужываўся для выцірання посуду, рук. На канцах была праткана чырвоная нітка. 4)Патрэбнічак – меў растрапаныя канцы: а) для выцірання рук, посуду; б) «на скорую руку білі дзяцей». 5)Тувален – шырокі ручнік.

Відазменнай формай ручніка былі наступныя. 1)Надзежнік – ручнік для накрыўкі дзяжы. 2)Налаўнік – ручнік для накрыўкі лаўкі. 3)Набожнік (багавік, набразнік, накутнік) – ручнік для накрывання іконы. Вызначаліся ручнікі для пэўных абрадаў. 4)Платок (плат) – ручнік для падарункаў. 5)Сватаў ручнік – вузкі ручнік з дабаўленнем палатніны. Радзінны ручнік – ручнік, на які прымалі нованароджанае дзіця. 6)Абыдзеннік – ручнік для пэўнага абраду. У час засухі, войнаў, эпідэмій жанчыны адной вёскі за дзень ці за ноч ткалі ручнік-абыдзённік, які вешалі на прыдарожны крыж, абносілі вакол вёскі, праганялі па ім хатнюю жывёлу.

Ручнікі былі абавязковым атрыбутам у вясельных, радзінных, пахавальных абрадах: на іх прымалі народжаных, яны ўваходзілі ў пасаг нявесты, былі неабходнай часткай падарункаў нявесты жаніху, сватам, родных жаніха; іх перавязвалі цераз плячо свата, пасцілалі пад ногі маладым у час вянчання; на ручніках апускалі труну ў магілу, іх павязвалі на магільны крыж. Ручнік у пахавальным абрадзе служыў шляхам для душ памерлых у іншы свет. У час засухі, войнаў, эпідэмій жанчыны адной вёскі за дзень ці за ноч ткалі ручнік-абыдзённік, які вешалі на прыдарожны крыж, абносілі вакол вёскі, праганялі па ім хатнюю жывёлу. Як мастацкая рэч, ручнік-набожнік размаўляе з намі на мове вобразаў, таму з ручнікам асацыіруюцца ўстойлівыя сімвалы-вобразы: ручнік-шлях, ручнік-повязь, ручнік-увасабленне дабра. Вобраз ручніка-шляху – сімвал лёсу і суадносіўся з ростам чалавека, памерамі яго жылля. Вобраз ручніка-шляху нараджаўся ў прадзенні ніці, прадаўжаўся ў сувоі палатна і даўжыні ручніка. Якая суадносілася з размахам рук. Ростам чалавека, памерамі яго жылля. Ручнік у вясельным абрадзе павінен быў спрыяць пераходу маладых у іншы ўзроставы і сацыяльны стан. Вобраз ручніка-повязі сімвалізуе ў вясельных абрадах сувязь двух пачаткаў – мужчынскага і жаночага, дзвюх сем’яў, двух родаў. У памінальных абрадах – непарыўную сувязь паміж

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

членамі роду. Ручнік-повязь прысутнічае ў памінальных абрадах і сімвалізуе непарыўную сувязь паміж членамі роду. Ручнік – увасабленне дабра выконваў свае засцерагальна-магічныя функцыі праз сімвалічныя якасці пражы і палатна, сакральнасць чырвонага колеру і знакавасць арнаменту, у ім схавана магічная сіла і нязменная функцыя ручніка як абярэга. Сімвалічная ідэя дабра найбольш ёміста ўвасоблены ў ручніках-абыдзенніках і аброчных.

Кожны арнамент складаецца са знакаў і яго можна параўнаць з зашыфраванай аповесцю пра жыццё нашага народа. Вельмі важным з'яўляюцца знакі абярэгі і памяці. Кожны знак размяшчаўся на вырабе, які меў пэўнае прызначэнне. На ручніку, які загортвалі дзіця, якімі выціралі малое пасля купання, быў вытканы ці вышыты сімвал маці, як самага дарагога для немаўляці чалавека. Дарэчы быў тут і сімвал абярэга, каб зберагчы малога ад дрэннага вока, хвароб і чараў.Такія ж сімвалы прысутнічалі на ручніку, які давалі салдату ў войска. Яшчэ на такім ручніку не лішнім быў сімвал хлеба, каб салдат не быў галодны.У ручніку з сімвалам хлеба, зямлі, абярэгу, сонца загортвалі абед, калі неслі на поле хлебаробу.Ручнікі з сімвалам памяці павязвалі на крыжы магілак, пакрывалі імі надмагільны курган.

Ручнікі з вышыванымі галубамі былі сімвалам закаханых, калі галубы глядзелі адзін на аднаго – каханне ўзаемнае, калі ж не да спадобы дзяўчыне жаніх – галубы глядзелі ў розныя бакі, сімвал няўдалага кахання. Вялікую ролю ў матывах народных арнаментаў адыгрывае колер. У Беларусі семантыка колераў выглядае так: чорны – маці-сыра Зямля, чырвоны – жыццё, чырвоны і белы – супрацьстаўленне жыцця і смерці.У абраднасці беларусаў шырока выкарыстоўваліся чырвоныя ніткі і тканіны з чырвоным арнаментам. У сімволіцы чырвонага колеру арнаменту ручніка ляжыць атаясамленне яго з усходам, поўднем, жыццёдайным колерам, сонца і таго куту хаты, дзе заўсёды робіцца покуць. [5, 128]

У Паазер'і захаваліся старажытныя прыёмы дэкаратыўна-арнаментальнага аздаблення абрадавых ручнікоў. Разам з тым праявы этнакультурнай традыцыі ў рэгіёне страцілі сваю першаснасць. Полацкія браныя ручнікі канца XIX – пачатку XX стагоддзяў вельмі ўражваюць. Каларытнае багацце, складанае перапляценне даўніх традыцый вышыўкі, ткацтва, надзвычай разнастайны арнамерт і яго кампазіцыя формы – вось чым уражваюць ручнікі гэтага рэгіёна. Шматярусны дэкор, затканы чырвоным з чорным. Раслінныя ўзоры тканін, складаны і разнастайны малюнак наводзіць на думку аб тым, што сфарміраваліся яны пад уздзеяннем прафесійных арнаменталістаў.

Асаблівасць палатнін Полаччыны – раўнамернае выкарыстанне бранага і выбарнага ткацтва, што прыводзіла ў адных выпадках да арнаментацыі ручнікоў змешанымі тэхнікамі, у другіх – вымагала арыгінальных кампазіцый, выкарыстанне якіх было магчыма выключна з дапамогай выбарнага ткацтва. Полацкіх браных ручнікоў канца XIX – пачатку XX стагоддзяў захавалася няшмат. Устойлівым паказчыкам этнарэгіянальных асаблівасцей ручнікоў полацкага тыпу з'яўляецца іх кампазіцыя. Канцы ручнікоў аформлены шырокім сеткаварамбічным бардзюрам (да 30 см у вышыню) бранага арнаменту, маса чырвонага колеру, якая адасоблена ад белай ручніковай палатніны

З паўночна-заходніх раёнаў Паазер'я паходзіць яшчэ адзін тып ручнікоў, традыцыі якога звязаны з культурай рускіх старавераў. Беларускі этнограф К.Т.Анікіевіч пісаў, што рускія старaверы наогул не зліваюцца з беларусамі і цвёрда трымаюцца старой веры. [1, 267]. Падцвярджэннем выказвання даследчыкаслужыць і аздабленне ручнікоў стараверaў, пабудаванае паводле традыцыйрускай Поўначы – Пскоўшчыны, Наўгародчыны, адкуль прыйшлі гэтыя людзі. Асноўнае адрозненне іх вырабаў – наяўнасць сюжэтных вышывак архаічнага тыпу з прысутнасцю антрапаморфных персанажаў (жаночых і мужчынскіх фігур, коннікаў), выяў дрэва, зааморфных (аленя, коней, ласёў), арнітаморфных (лебедзяў, гусей, качак) матываў. У большасці выпадкаў на іх тканінах адлюстраваны амаль адзіны сюжэт – сусветнае дрэва.

Гісторыя беларускага народа – каштоўная крыніца паглыблення ведаў пра яго традыцыі і звычаі. У сваёй працы я паспрабавала абагульніць тыя дадзеныя, якія былі атрыманы падчас даследавання ручнікоў, якія знаходзяцца ў музеі каляндарна-абрадавых традыцый школы, а таксама карысталася матэрыяламі Полацкага музея ткацтва Паазер'я. Супрацоўнікі Полацкага музея былі кансультантамі па тэме даследавання. Работа па вывучэнні функцый ручніка ў побыце беларусаў будзе працягнута. Змест кожнага ручніка будзе расшыфраваны і прачытаны. Праходзяць гады, мяняюцца густы, на змену рукам чалавечым прыходзяць машыны, створаныя тымі ж рукамі. Але пакуль побач з чалавекам будзе жыць пачуццё прыгожага, імкненне да натуральнага, сапраўднага. Будзе жыць ручнік, бо спрадвечнае застаецца вечным.

**Спіс літаратуры:**


1. Байбурын, А.К. Жыллё ў абрадах і ўяўленнях ўсходніх славян / А.К. Байбурын. – Л. : Перспектива, 1983. – 362 с.
2. Бандарчык, В. Земляробчы каляндар / В. Бандарчык, К. Кабашнікаў, А. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 428 с.
3. Беларускі народны каляндар / аўтар-уклад. А. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.
4. Беларускае народнае мастацтва. – Мінск : Полымя, 1951. – 220 с.
5. Беларускі народны арнамент. Жывапіс Беларусі XII-XVII ст.ст. – Мінск : Асвета, 1963. – 240 с.
6. Крук, І. Следам за сонцам. Беларускі народны каляндар / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 215 с.
7. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2002. – 232 с.
8. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мінск : Полымя, 1994. – 328 с.
9. Этнаграфія Беларусі : Энцыклапедыя. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 576 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ